УДК 001(092)

# Гандлёвы шлях «з варагаў у грэкі» – беларускі адрэзак

Арбузаў А.Ц.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

На тэрыторыі Беларусі налічваецца больш за 10 тыс. вялікіх і малых азёр, якія жывяцца 20,8 тыс. рэкамі. У старажытнасці водны патэнцыял выкарыстоўваўся ў асноўным у якасці шляхоў зносін, самым знакамітым з якіх быў "з варагаў у грэкі", дзякуючы яму, у V – VI ст.ст. узнік, а ў 862 годзе пісьмова ўзгадваецца Полацк – адзін з самых старажытных гарадоў усёй Усходняй Еўропы.

Гандлёвы шлях "з варагаў у грэкі" злучаў Балтыйскае (Варажскае) з Чорным морамі (Пантыйскім ці Рускім). Значны адрэзак маршрута праходзіў па галоўных дарогах таго часу Дняпру і Заходняй Дзвіне, якая была добра вядома старажытным грэкам, рымлянам і называлася ў тыя часы Эрыдан, Рубон, Дуна, Дзіна. Да нашай эры гэты маршрут быў як бурштынавы гандлёвы шлях. Яго праклалі скандынаўскія вікінгі, і ён праходзіў праз Фінскі заліў – Ладажскае возера – рэкі Волхаў, Ловаць, Усвяча, Каспля – Дняпроўскія валокі і далей праз Чорнае мора ў Міжземнае мора. Крыху пазней вікінгі асвоілі Заходнедзвінскі ці Полацкі напрамак гандлёвага шляху. Ён лічыўся карацейшым, а значыць і больш выгадным. К IX – X стагоддзям у Еўропе склалася разгалінаваная сістэма транс'еўрапейскіх водных шляхоў зносін, але полацкі варыянт паранейшаму прыцягваў увагу вікінгаў-варагаў.

Прыгутнасць скандынаваў на усходнеславянскіх землях летапіс адзначае пад 859 г. Асноўнымі цэнтрамі – стартавай пляцоўкай маршрута былі старашведская Бірка і г. Вісбю на востраве Готланд. Менавіта адтуль праз Фінскі заліў, Дзвіну і Дняпро плылі гандлёвыя судны вікінгаў аж да Чорнага і Сяродземнага мора ва ўсе краіны міжземнамор'я і перш за ўсіх Візантыю. Туды яны везлі розныя тавары і рабоў, якіх абменьвалі на бартэрнай аснове альбо на срэбра – куфічныя дырхемы. У зваротным напрамку везлі медныя, свінцовыя вырабы, каней, скуры, воск, мёд і інш. Вандроўную карту ў дапамогу купцам стварыў у XVI ст. шведскі картограф Олаус Магнус, які беларускі адрэзак гандлёвага шляху назваў Белай Руссю.

Вікінгі-варагі не толькі гандлявалі, але яны учынялі рабаўнічыя апусташальныя набегі, служылі ў якасці наемных ваенных ахоўнікаў, удзельнічалі ў дыпламатычнай і ўпраўленчай сферах. На беларускім адрэзку гандлёвага шляху было заснавана некалькі умацаваных гарадзішчаў: Сураж, Каспля, Орша, Масковічы, Пруднікі і інш.